View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

М.В.Шабовіч

# АКАЗІЯНАЛІЗМЫ Ў ПАЭЗІІ ВАЛЕРЫЯ МАКСІМОВІЧА

*(на прыкладзе кнігі вершаў "Мяцежнай споведзі скрыжалі")*

Валерый Максімовіч – адзін з тых паэтаў, хто сёння найбольш актыўна звяртаецца да аўтарскай словатворчасці. Магчыма, штуршком для гэтага паслужыла даследчыцкая дзейнасць гэтага слыннага навукоўца, а менавіта яго падрабязнае, засяроджанае знаёмства з паэзіяй 20-х гадоў ХХ стагоддзя, калі такія лексемы былі вызначальнай рысай тагачаснай беларускай літаратуры. Хораша засвоіўшы прыёмы і метады словатворчасці маладнякоўцаў і ўзвышэнцаў, В.Максімовіч нярэдка паказвае сапраўдныя ўзоры індывідуальнй дэрывацыі. Цяжка адшукаць старонку ў яго кнізе "Мяцежнай споведзі скрыжалі" (Мінск, 2012), дзе б не было наватвораў. Часам паэт настолькі захапляецца словатворчасцю, што ў адной вершаванай страфе ўжывае па некалькі аказіяналізмаў.

Зорны россып расквеціў нябёс далячынь,

*Змесяцовіўся* вечар *барвова-ружовы.*

Будуць доўга гучаць у *святлянай* начы

І мяне закалыхваць матуліны словы.

("Размова з маці", с.64)

Усміхаўся ранак мне ружовы,

Гаманіў *стозвонна* белы свет,

І п'яніў *дурманліва-хмялёвы*

У садах вясенніх яркі цвет.

("Запаветнае", с.13)

Названы прыём аўтар пераносіць і на сваю песенную творчасць, хоць у гэтым жанры трэба вельмі асцярожна падыходзіць да стварэння ўласных інавацый, па магчымасці абыходзіцца агульнанародным лексічным запасам. Разам з тым, наватворы Валерыя Максімовіча даволі арганічна ўпісваюцца ў структуру тэксту і будуць правільна зразуметы не толькі выканаўцамі (а песні на словы В.Максімовіча выконвае і такі вядомы калектыў, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ансамбль “Песняры”!), але і слухачамі. Вось некаторыя прыклады з песеннай словатворчасці паэта: “Вабіць *паднебна-блакітная* даль, Клічуць *жытнёва-зялёныя* гоні (“Спявай, душа мая”, с.100); Ты красуй у яркай квецені, *шумнаспеўны* мой родны край! (“Песня зямлі”, с.104); …Развеяць толькі б крыл узмахам Свой *несуцішна-скрушны* жаль (“На беразе сваёй надзеі”, с.102); Ах, крамяныя ночы летнія – *роснажнівеньскі* зарапад (“Роснажнівеньскі зарапад”, с.105). Пры ўсёй сваёй семантычна-словаўтваральнай празрыстасці такія словы ўсё ж не вельмі пажаданыя ў песнях, і хочацца параіць аўтару пры далейшым стварэнні падобных тэкстаў па магчымасці абыходзіцца без аказіяналізмаў, якія могуць абцяжарыць шлях твора да слухача (а найперш да кампазітара і выканаўцы). Мяркую, аўтар на ўласным вопыце гэта адчуў і без нашай падказкі.

Спынімся падрабязней на словатворчых знаходках В.Максімовіча ў паэтычных тэкстах, якія займаюць большую частку названай вышэй кнігі. Аўтар аддае перавагу прыметнікавым наватворам, асабліва прыметнікам-кампазітам, якія склалі амаль 50% ад усіх наватвораў паэта. І ў першую чаргу гэта кампазіты са спалучальнымі адносінамі асноў. Кампаненты такіх лексем могуць абазначаць розныя прыметы: ***васількова-рамонкавы***: *А памяць вядзе мяне зноў неўпрыкмет… у васількова-рамонкавы свет…* (“Мой золак”, с.23); ***вячыста-белы***: *Таму я пэўны: будуць жыць І мой вячыста-белы будзень, І вы, спагадлівыя людзі…* (“Мой вырак”, с.27); ***вячыста-казачны***: *…І над блакітнай далеччу бясконцай Стаяў вячыста-казачны спакой* (“На хутары былым”, с.55); ***духмяна-млявы***: *Духмяна-млявым ціхім адвячоркам Далёкі водсвет мроі ўскалыхне…* (“Астравок маленства”, с. 15); ***пахмурна-калючы***: *Чырвоныя коні… і ў ночы сцюдзёнай, пахмурна-калючай, Трывожна сваімі званкамі звіняць* (“Чырвоныя коні”, с.63); ***струменіста-чысты***: *…Дай мне простага шчасця зямнога, струменіста-чыстага…* (“На самоце”, с.46).

Ёсць і кампазіты з сінанімічнымі адносінамі кампанентаў: ***гнятліва-журботны***: *Зноў дыхнуў на мяне падбадзёрлівы вецер І падняў мой гнятліва-журботны настрой* (“Падбадзёрлівы вецер”, с.77); ***задуменіста-сцішаны***: *Край ты мой задуменіста-сцішаны, сінявокі, мурожны, лясны…* (“Край ты мой…”, с.11); ***помсліва-злы***: *Быццам вампір ці якая пачвара, Помсліва-злая ў істоце сваёй, – Легла Чарнобыля чорная хмара На Беларусі маёй* (“Званы – б’юць!”, с.44); ); ***святляна-зорны***: *Дзіўнай ночкай святляна-зорнай… Я цябе цалаваў-мілаваў* (“Роснажнівеньскі зарапад”, с.105); ***таемна-загадкавы***: *…Нейкі таемна-загадкавы знак Часу наступнаму ён [звон] пасылае* (“Мой золак”, с.21).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Радзей адзначаны дэрываты з антанімічнымі ці блізкімі да антанімічных кампанентамі: ***журботна-светлы***: *Уратаваць! Мне вырак ёсць Ад сіл зямных і сіл нябесных: Журботна-светлай сваёй песняй Утаймаваць людскую злосць…* (“Мой вырак”, с.26); ***светла-сумны***: *Такі ж і мой прысудны кон і лёс – …Праліць нямала светла-сумных слёз* (“Прага любові”, с.81).

Адносна нешырока прадстаўлены ў кнізе кампазіты з падпарадкавальнымі адносінамі кампанентаў: ***брудна-шэры***: *І ўраз драконы-крумкачы Паўсюль зларадна завіжуюць – Сабе здабычу ўміг пачуюць З-пад брудна-шэрых аблачын* (“Мой вырак”, с.26); ***невыказна-родны***: *Мне да болю невыказна-родным Стала ўсё жывое на зямлі* (“Мая восень”, с.58); ***невымоўна-слотны***: *І ціха зойдзецца душа У невымоўна-слотнай скрусе* (“Мой вырак”, с.26); ***святляна-прамяністы, пунсова-яркі***: *І запалаў шыпшынавы касцёр У зелені святляна-прамяністай, Нібы пунсова-яркія manісты Сабою разукквецілі ўвесь двор* (“На хутары былым”, с.54). У лексеме *пунсова-яркі* адценне колеру выражае апорны кампанент.

Пры ўтварэнні новых прыметнікавых лексем В.Максімовіч не прамінае звярнуцца і да складана-суфіксальнага спосабу: ***вясноваспеўны*** (ад *вясновы спеў*), ***ружоваросыпны*** (ад *ружовы россып*): *Хай доўжыцца бясконца час Вясноваспеўнага буяння Ружоваросыпных прыўкрас* (“Нязбытнае”, с.73); ***гучнаспеўны*** (ад *гучны спеў*): *У добры хай крочыць, У сонечны шлях Дзяцінства па ўсёй гучнаспеўнай планеце…* (“Мой золак”, с.23); ***роснажнівеньскі*** (ад *росны жнівень*): *І вянчаў нас – дажджом праліўся – Роснажнівеньскі зарапад* (“Роснажнівеньскі зарапад”, с.105); ***светласумны*** (ад *светлы сум*): *Мой краю серабрысты, Мой светласумны боль!* (“Прасветлае”, с.7); **шумнаспеўны** (ад *шумны спеў*): *Вы вядзіце мяне, мае сцежкі-дарожкі, Да маіх шумнаспеўных зялёных прысад* (“Сцежкі-дарожкі”, с.8); *Ты красуй у яркай квецені, шумнаспеўны мой родны край!* (“Песня зямлі”, с.104.

Не так часта, але сустракаюцца ў кнізе і складана-нульсуфіксальныя прыметнікі: ***зеленалісты*** (ад *зялёны ліст*): *Мой край зеленалісты…* (“Прасветлае”, с.7); ***густатравы*** (ад *густая трава*): *Я помню, рос рабінаў дружны рад На той мяжы шырокай, густатравай* (“На мяжы дзяцінства”, с.16).

Асобныя прыметнікі-кампазіты з цяжкасцю паддаюцца вытлумачэнню як семантыкі, так і дэрывацыйнай матывацыі: ***сэрцамяцежны***: *Ды, кінуўшы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*погляд на хеўру драпежную, Прашу: залічыце, сябры, і мяне У вашу дывізію сэрцамяцежную* (“Услед за марай”, с.32).

Суфіксальныя аказіянальныя прыметнікі прадстаўлены наступнымі лексемамі: ***вячорысты*** (ад *вечар*): *... І пад шэпт таямнічы вячорыстых рос чую сэрцаў – усіх закаханых – трымценне...* (“Падбадзёрлівы вецер”, с.77); ***гаркатны*** (ад *гаркота*): *І ўпершыню, не па-дзіцячы рана, Слязінку гаркатную праранію* (“На мяжы дзяцінства”, с.16); ***змяючы*** (ад *змяя*): *Страшней, калі можа блізкі забіць, Наліць у пацір табе яду змяючага* (Уладзіміру Караткевічу, с. 36); ***святлынны*** (ад *святлынь*): *Святлынны час!* (“Астравок маленства”, с.14); ***святляны*** (ад *светлы* або *святло*): *Будуць доўга гучаць у святлянай начы І мяне закалыхваць матуліны словы* (Размова з маці, с.64).

Прэфіксальна-суфіксальныя прыметнікі прадстаўлены адзінкавымі лексемамі: ***адлюдны*** (ад *ад людзей*): *–Адлюдны чейкі, – часам так Казала маці ў недаўменні...* (“Нязбытнае”, с.66); ***нясцішны*** (ад *не сціхаць*): *Нясцішны пошум-перагуд Душы варожыць наталенне...* (“Нязбытнае”, с.67); ***няўлежны*** (ад *не ўлежаць*): *Вые-скуголіць звяр’ё – Дзікая хеўра драпежная, – Точыць клыкоў вастрыё На сэрца – дзіцятка няўлежнае* (“Балада сэрца”, с.25), *...А там, на чароўнай далёкай зямлі, Жывуць дружна людзі, душою няўлежныя* (“Услед за марай”, с. 32). Гэтыя лексемы адносім да наватвораў чыста ўмоўна; хутчэй за ўсё яны ўзяты з мясцовага дыялекту паэта.

Аказіянальныя назоўнікі ў творах В.Максімовіча ўтвораны найперш нульсуфіксальным і суфіксальным спосабамі. З нульсуфіксальных лексем адзначым дэрываты ***спадзеў*** (ад *спадзявацца* або *спадзяванне*): *Ды гэта – марны мой спадзеў* (“Нязбытнае”, с.72) і ***сцяга*** (ад сцяжына): *Бяжыць сцяга жыцця майго, бяжыць...* (“Мой свет”, с.125). Прыведзеныя нульсуфіксальныя лексемы шырока выкарыстоўваюцца ў сучаснай беларускай паэзіі, і В.Максімовіч, ужываючы іх, хутчэй папулярызуе знаходкі сваіх калег па пяры, чым праяўляе ўласную словатворчую фантазію. Такім жа папулярызатарам наватвораў У.Дубоўкі быў у свой час М.Машара. Ёсць спадзяванне, што разгледжаныя нульсуфіксальныя лексемы, у тым ліку і дзякуючы В.Максімовічу, неўзабаве набудуць слоўнікавую прапіску.

Суфіксальныя назоўнікавыя лексемы ўтвораны з дапамогай суфіксаў **-асць**: ***месяцовасць*** (ад *месяцовы*): *Імгненне, прашу, спыніся, Вярні месяцовасць мрой...* (“Мройны малебен”, с.74); ***святлыннасць*** (ад *святлынны*): *Абачліва ў сэрцы з нас кожны прыпас Бярэмя ўспамінаў ад*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*дзён наймілейшых, – Цяпельцам жывым яны радуюць нас І поўняць святлыннасцю найдаражэйшай* ("Мой золак", с.21); **-ств-а**: ***прыгоства*** (ад *прыгожы*): *Як шмат хто з нас, я – паняты прыгоства* ("Прага любові", с.79); *Краса вачэй, прыгоства вабных цел Душу маю палоняць ўсю дазвання* ("Прага любові", с.82).

Намі адзначана і некалькі складана-суфіксальных назоўнікаў-наватвораў: ***ахвярадарэнне*** (ад *ахвяру дарыць*; калька з рускага *жертвоприношение*): *...Не просіць яно [сэрца] тых ахвярадарэнняў...* (Мой золак, с.21); ***шматрадкоўе*** (ад *шмат радкоў*): *...Вось выплюснеш, бы хвалю, шматрадкоўе – І ты найшчасны ў свеце чалавек* ("Спапяленне", с.31). Падставай для ўзнікнення дэрывата *ахвярадарэнне*, магмыма, з'явілася пэўная незадаволенасць аўтара слоўнікавай лексемай *ахвярапрынашэнне*.

Даволі шырока выкарыстоўвае В.Максімовіч і прыслоўныя аказіяналізмы, большасць з якіх утвораны суфіксальным спосабам (з дапамогай суфікса **-а**): ***бліскавічна*** (ад *бліскавічны*): *Б'юць у яго сэрца перуны Ўсцяж – бліскавічна, бязлітасна...* ("Балада сэрца", с.25); ***зорыста*** (ад *зорысты*): *Нягаснучы рабінаў ланцужок У сэрцы маім зорыста свіціцца...* ("На мяжы дзяцінства", с.17); ***малітоўна*** (ад *малітоўны*): *...Толькі аб адным я малітоўна У зямлі і у жыцця прашу* ("Запаветнае", с.13); ***набатна*** (ад *набатны*): *І зноў шумяць набатна вершаліны...* ("На хутары былым", с.54); ***несыходна*** (ад *несыходны*): *Нейкі нясцішана-поклічны звон Дзесь ува мне несыходна вякуе* ("Мой золак", с.22); ***сціхотна*** (ад *сціхотны*): *За часу павалокай сціхотна не астынь* ("Прасветлае", с.7); ***полымна*** (ад *полымны*): *На небасхіле полымна гарэць Зарніцы, нібы колісь у маленстве* ("Святло зарніц", с.61); ***стозвонна*** (ад *стозвонны*): *Усміхаўся ранак мне ружовы, Гамоніў стозвонна белы свет...* ( "Запаветнае, с.13). Некаторыя з прыведзеных прыслоўяў маюць множную матывацыю і могуць разглядацца як адназоўнікавыя ці аддзеяслоўныя дэрываты з суфіксам **-на**: *бліскавічны*=бліскаавіц-а + -на; *набатна* = набат + -на; *полымна* = полым-я + на; *сціхотна* = сціхаць + -на; несыходна = *не сыходз(іць)* + на. Апошнюю лексему пры такой матывацыі варта кваліфікаваць як прэфіксальна-суфіксальнае ўтварэнне.

Аказіянальныя безасабова-прэдыкатыўныя словы не атрымалі пашырэння ў паэзіі В.Максімовіча. Намі адзначана толькі 2 дэрываты: ***сцюжна***: *[Звон] Перагукаецца рэхам натужна Ў час, калі хочацца мне заспяваць І калі так у душы маёй сцюжна* ("Мой золак", с.20); ***горка-сумна***: *І сам я – ў гадах узмужнелы – з табой, – Ці я весялюся, ці мне горка-сумна*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(“Мой золак”, с.23). Першы наватвор матывуецца прыметнікам *сцюжны* або назоўнікам *сцюжа*, а другі словамі катэгорыі стану *горка* і *сумна*.

Дзеяслоўных аказіянальных лексем у кнізе таксама няшмат. Яны ўтвораны рознымі спосабамі: суфіксальным (***заранкаваць*** (ад *заранак*): *Але маўчыш ты, свеце ясны мой, Нібыта слоў маіх зусім не чуеш, А я з табой і днюю, і начую, І заранкую акурат з табой* (“Мой свет”, с.125)); прэфіксальна-суфіксальным (***ссіраціць*** (ад *сірата*): *...Покуль бура... не ссіраціла гэты ціхі кут* (“На хутары былым”, с.54)); прэфіксальна-суфіксальна-пастфіксальным (***узвіхурыцца*** (ад *віхура*): *Вецер, што ж ты так узвіхурыўся?..* (“Вецер і я”, с.43); ***змесяцовіцца*** (ад *месяц* або *месяцовы*): *...Змесяцовіўся вечар барвова-ружовы...* (“Размова з маці”, с.64).

Такім чынам, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што Валерый Максімовіч у сваёй паэзіі актыўна звяртаецца да словатворчасці і ў лепшых сваіх наватворах паказвае невычэрпныя магчымасці роднага слова, гнуткага і мілагучнага, здольнага перадаць найтанчэйшыя адценні сэнсу. Намі зафіксавана каля сотні аказіяналізмаў (і гэта ў адной кнізе!), прычым некаторыя з іх (*шумнаспеўны*, *няўлежчы*, *прыгоства*) паэт ужывае двойчы. Застаецца толькі пажадаць аўтару і надалей ісці сваім шляхам да вяршынь паэзіі. І, ведаючы працавітасць В.Максімовіча, няцяжка прадказаць новыя сустрэчы з творамі і наватворамі гэтага неардынарнага паэта і чалавека. “Хай ясняцца без скрухі і без жалю Твае “Мяцежнай споведзі скрыжалі”!”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ